Музей у Год навукі

## Да ўгодкаў яснавяльможнай пані

***Сёлета спаўняецца 280 гадоў з дня нараджэння маці Міхала Клеафаса Агінскага – графіні Паўліны Шэмбек. Гэтай падзеі і была прысвечана сустрэча ў гісторыка-літаратурнай гасцёўні Залескага музея-сядзібы. Да таго ж, навуковы супрацоўнік музея Таццяна Кляшчонак займела цікавыя біяграфічныя знаходкі прадстаўнікоў гэтага слыннага роду, якімі імкнулася падзяліцца з аматарамі даўніны і шчырымі сябрамі музея-сядзібы – членамі грамадскага аб'яднання "Сяльчанка".***

Музей – найперш навуковая ўстанова. Бясспрэчна, стабільную будучыню яна будзе мецць толькі тады, калі не будзе спыняцца ў папаўненні фондаў, пошуках і глыбокім вывучэнні дакументаў і цікавых рарытэтаў, абнаўленні экспазіцый. Мэта музейнай дзейнасці - камплектаванне спецыфічных калекцый і не толькі іх захаванне, але і папулярызацыя дзеля ажыццяўлення адукацыйна-выхаваўчай функцыі і прыцягнення новых наведвальнікаў. У Год навукі гэтаму надаецца найважнейшае значэнне.

Напачатку гасцей чакала віртуальнае перамяшчэнне ў 18 стагоддзе дзякуючы тэатралізаванай сцэне, падчас якой Паўліна Агінская (навуковы супрацоўнік Таццяна Кляшчонак) размаўляла з дачкой Юзэфай (намеснік дырэктара музея Святлана Кенька) і гувернёрам Жанам Рале (гісторык Аляксандр Міхалкоўскі).



Шмат новых цікавых звестак пра жыццё роду Агінскіх, нашчадкаў Паўліны і яе мужа Анджэя, пачулі прысутныя. А таксама мелі магчымасць пераканацца, што, як і Міхал Клеафас, яго бацькі і продкі былі ўплывовымі асобамі Рэчы Паспалітай. Пацвярджэннем таму стаў ліст-спачуванне караля польскага, Вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага да вяльможнай пані Паўліны Агінскай, у якім кароль назваў пакойнага Анджэя Агінскага добрасумленным сынам Айчыны і выказаў упэўненасць, што сын Міхал Клеафас вартасна прадоўжыць справу бацькі.

Пра душэўныя якасці маці слыннага кампазітара і палітычнага дзеяча і пра тое, як дзеці ставіліся да маці, прысутныя даведаліся з мемуараў самога Міхала Клеафаса Агінскага, у якіх ён называў яе

адной з добрасумленных і прыстойных жанчын Рэчы Паспалітай. Хаця лёс Паўліну Шэмбек не песціў. Яна тройчы станавілася ўдавой. Ад першых двух мужоў мела па сыну, а ад трэцяга Анджэя Агінскага, ваяводы трокскага, дачку Юзэфу і сына Міхала Клеафаса. Шматлікія дакументы, копіі касцельных актаў, шлюбных кантрактаў, мемуары і ліставанні яшчэ патрабуюць пільных даследаванняў і аналізу спецыялістаў. Застаецца спадзявацца, што наведвальнікаў музея-сядзібы чакаюць і наперад новыя адкрыцці і цікавыя імпрэзы.



Упрыгожылі імпрэзу фартэпіянныя творы ў выкананні музычнага кіраўніка ясляў-сада №8 Алены Майсак, відэафільмы пра палац сям'і Агінскіх у польскім Гузаве і музей у Рэтавасе. Напрыканцы сустрэчы дырэктар музея-сядзібы Людміла Градзіцкая прадэманстравала сертыфікат, які атрымала за актыўную праектную дзейнасць, да якой мае дачыненне і "Сяльчанка".

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**

**Фота аўтара.**

***Аляксандр МІХАЛКОЎСКІ ў ролі настаўніка Жана Рале. Слухаючы паланэз "Развітанне з Радзімай".***